**Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а**

Урок беларускай мовы ў 5 класе

І.М.Пірштук,

настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі

СШ № 3 г. Івацэвічы

Мэта: замацаванне правілаў вымаўлення і напісання о, э, а ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах.

Задачы:

- узнавіць веды пра правапіс і вымаўленне галосных о, э, а;
- выпрацаваць уменне правільнага пісьма на правапіс галосных о, э, а;
- замацаваць на практыцы.

Тып: урок фарміравання і замацавання новых уменняў і навыкаў.

Формы работы на ўроку: індывідуальная, франтальная, групавая.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне: вучэбны дапаможнік для 5 класа, выкарыстанне сродкаў ІКТ, нагляднs і раздатачны матэрыял.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант** (на экране – тэма ўрока).

1.Слова настаўніка.

Н а с т а ў н і к. Добры дзень усім  прысутным на ўроку: і вучням, і настаўнікам. Спадзяюся, што сённяшні ўрок будзе добрым, плённым і карысным для ўсіх.

**II. Праверка дамашняга задання** (пр.56, стар.27)**.**

**III. Актуалізацыя ведаў.**

1.Якія бываюць сказы  па мэце выказвання?

2.Якія  бываюць сказы па інтанацыі? *(Клічныя і няклічныя.)*

3.Назавіце галоўныя члены сказа?

4.На пытанні хто? або што? адказвваe ...*(дзейнік.)*

5.На пытанні што робіць прадмет? які ён? адказвае … *(выказнік.)*

6.Назавіце даданыя члены сказа?

7.На якія пытанні адказвае дапаўненне? *(На пытанні ўскосных склонаў)*

8. На якія пытанні адказвае азначэнне?

*(Які?якая?якое?якія?чый?чыя?чыё?чые?)*

9. На якія пытанні адказвае акалічнасць? *(Калі?дзе?куды? адкуль?як?)*

**IV. Лінгвістычная хвілінка.**

Запісаць сказ і зрабіць <u>сінтаксічны разбор</u> сказа.
*Матуля прыгатавала смачны сняданак. Птушкі паляцелі ў вырай.*

**V. Паведамленне тэмы і мэт урока.**

Н а с т а ў н і к. Калі я падышла сёння да дзвярэй класа, то ўбачыла вось гэты канверт, на якім напісана "Угадай літару". Давайце яго раскрыем і даведаемся, што мы павінны ўгадаць.

**Заданне:** пра якую галосную літару ідзе размова?

1) Гэта літара з'вілася ў беларускіх тэкстах у канцы 16 ст., само яе з'яўленне ў нашай мове звязана з запазычаннем;
2) у іншых сучасных славянскіх кірылічных алфавітах яна не выкарыстоўваецца;
3) сёння ў спрадвечна беларускіх словах пішацца пад націскам, падлягае закону акання. ***(Літара Э.)***

- Прывядзіце прыклады. *(Стрэхі-страха, шэры-шарэць.)*
- Чаму ўрок пачаўся з гэтага задання?

*( Бо на мінулым уроку вывучалі тэму "Правапіс о,э,а".)*
А сёння мы прадоўжым тэму мінулага ўрока **"Вымаўленне і правапіс о,э,а"**
Мэта: замацаванне правілаў вымаўлення і напісання о, э, а ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах.

**VI. Бліц-апытванне.**

☂ Графічны знак, які выкарыстоўваецца для абазначэння гукаў мовы. *(Літара.)*
☂ Сукупнасць літар, размешчаных ва ўстаноўленым парадку. *(Алфавіт.)*
☂ Адзін або некалькі гукаў, якія вымаўляюцца адным штуршком паветра. *(Склад.)*
☂ У слове столькі складоў, колькі *(галосных гукаў).*
☂ Больш гучнае і працяглае вымаўленне аднаго са складоў слова.*(Націск.)*
☂ Галосны гук, на які падае націск, і склад з гэтым галосным называецца *(націскным).*
☂ Астатнія галосныя гукі і склады ў слове *(ненацісныя).*
☂ У беларускай мове галосных гукаў *(6).*
☂ Для іх абазначэння на пісьме выкарыстоўваюць *(10)* літар.

**VII. Замацаванне.**

**Заданні**

**1.** <u>Настаўнік.</u>Прапаную кожнай *групе* выканаць заданне пад № 1, карыстаючыся правілам падручніка. На падрыхтоўку вам адводзіцца 2 хвіліны:
🌍 1-я група выпіша словы, у якіх пішуцца о, э, а ў спрадвечна беларускіх словах;
🌍 2-я група выпіша словы са спалучэннямі -ро-, -ло;
🌍 3-я група выпіша словы, у якіх ненаціскныя спалучэнні -эль, -эр- у запазычаных словах перадаюцца як –ар, -аль;

🌍 4-я група выпіша словы, у якіх захоўваюцца спалучэнні -эр-,-эль;
Заданне №1. Шніцаль, сон, грэйдар, сэрца, камп'ютар, галасы, майстар, Одэр, карані, Юпітэр, Ландэр, колас, гром, глотка, блохі, дровы,

**VIII. Фізкультхвілінка.** *(А зараз трохі адпачнем.)*

Калі я буду называць прыметнікі, вы павінны хлопнуць адзін раз у далоні, назоўнікі – два разы хлопнуць у далоні( *зялёны, сшытак, прыгожы, яблык, добры,верабей, радасны, малы, мядзведзь, ветлівы, песня, марозны.*)

1. Практыкаванне 58.Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.
   1 група – 1-4 сказы;
   2 група – 5-8 сказы
2. Заданне №2: устаўце прапушчаныя літары, растлумачыць правапіс арфаграм. (Два вучні пішуць на дошцы, а астатнія – у сшытках.)

| 1 група | 2 група |
|---|---|
| Г_лас – г_ласы. | Р_кі – р_ка. |
| З_лата – з_латы. | Стр_хі – стр_ха. |
| Р_сы – р_са. | Тр_сці – тр_суць. |
| Г_рад – г_рады. | Др_ва – др_ўляны. |
| М_ст – м_сты. | Ш_пт – ш_птаць. |
| Зв_н – зв_ны. | Ш_лест – ш_лясцець. |

**3.** Заданне №3: падабраць аднакаранёвыя словы, каб *о, э* перайшло ў *а*.
Узор: дрома – дрымота. (Для ўсіх)
(Адзін вучань піша на дошцы, астатнія – у сшытках.)
1.Кроў - (крывавы).
2.Дровы – (дрывотня).
3.Брод – (брысці).
4.Глотка – (глытаць).
5.Крошка – (крышыць).

**4.** Практыкаванне 60. Да дзеяслова падбярыце назоўнікі, каб атрымаліся выразы з прыведзенымі значэннямі.
глытаць слінкі
глытаць слёзы
глытаць словы
Хлопчык стаяў моўчкі і глытаў слёзы.

**5.** Заданне №4. Прыём «Карэктар».
Хрэстаматыя, крашыць , драўляны, інжэнер ,кандытар, цана, глатаць , трыа, трэвожны, сальфеджыа, яблык, фламастэр.

Адказы. Хрэстаматыя, крашыць (ы), драўляны, інжэнер (ы),кандытар, цана, глатаць (ы), трыа, трэвожны(ы), сальфеджыа, яблык, фламастэр(ар).

**6.** Заданне №5. Пастаўце націск у кожным слове. Устаўце прапушчаныя літары.

Кл _пат – кл _паціцца. Пр_ста – спр_сціць.
Ц_лы – ац_лелы. Спр_чка – спр_чацца.
Прыч_п – ч_пляць. Прац_джаны – прац_дзіць.
Р_зум – р_зумовы. Ц_гла – ц_гляны.
Ж_мчуг – ж_мчужына. К_лер – к_ляровы.

**7.** Заданне 6. Вусны пераклад.
Жёлтый, река, чемодан, широкий, жёлудь, корень,чёрствый, серый, жевать, чебурек, передать, шерсть.
*(Жоўты, рака, чамадан, шырокі, жолуд, корань, чэрствы, шэры, жаваць, чабурэк, перадаць, шэрсць.)*

**VIII. Кантрольна-рэфлексійны этап.**

**Тэст «Правапіс галосных о, э, а»**

1 варыянт
А. Запішыце правільныя пары слоў:
1) кроў- крывавы;
2) крошка – крашыць;
3) бровы – браво.
Б.Запішыце словы, якія няправільна запісаныя:
1) шніцаль; 3) світэр;
2) камп'ютэр; 4) Юпітэр.
Адказы: А – 1; Б – 2,3.

2 варыянт
А. Запішыце правільныя пары слоў:
1) дрома – драмота;
2) брод – брысці;
3) дровы – дравотня.
Б.Запішыце словы, якія няправільна запісаныя:
1) кандытар; 3) фламастэр;
2) майстэр; 4) Одэр.
Адказы: А – 2; Б – 2,3.

**IX.** Падвядзенне вынікаў.
Дзякуй за ўрок. Шануйце беларускую мову, бо, як сказаў беларускі пісьменнік У.Караткевіч: "Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў".

**X.** Дамашняе заданне. Зараз запішыце дамашняе заданне ў дзённікі. Старонка 30, практыкаванне 61. Згодна ўмове, патрэбна выпісаць словы, у якіх прапушчана літара э.

**Заданне “Угадай літару”  :** пра якую галосную літару ідзе размова?

1) Гэта літара з’вілася ў беларускіх тэкстах у канцы 16 ст., само яе з’яўленне ў нашай мове звязана з запазычаннем;

2) у іншых сучасных славянскіх кірылічных алфавітах яна не выкарыстоўваецца;

3) сёння ў спрадвечна беларускіх словах пішацца пад націскам, падлягае закону акання. (Літара Э.)

- Прывядзіце прыклады. (Стрэхі-страха, шэры-шарэць.)

**Заданне №1**
🌍 1-я група выпіша словы, у якіх пішуцца о, э, а ў спрадвечна беларускіх
словах;
🌍 2-я група выпіша словы са спалучэннямі -ро-, -ло;
🌍 3-я група выпіша словы, у якіх ненацiскныя спалучэнні -эль,
-эр- у запазычаных словах перадаюцца як –ар, -аль;
🌍 4-я група выпіша словы, у якіх захоўваюцца спалучэнні -эр-,-эль;
Словы. Шніцаль, сон, грэйдар, сэрца, камп'ютар, галасы, майстар, Одэр, карані, Юпітэр, Ландэр, колас, гром, глотка, блохі, дровы,
**Заданне №2:** уставіць прапушчаныя літары, растлумачыць правапіс арфаграм. (Два вучні пішуць на дошцы, а астатнія – у сшытках.)

| 1 група | 2 група |
|---|---|
| Г_лас – г_ласы. | Р_кі – р_ка. |
| З_лата – з_латы. | Стр_хі – стр_ха. |
| Р_сы – р_са. | Тр_сці – тр_суць. |
| Г_рад – г_рады. | Др_ва – др_ўляны. |
| М_ст – м_сты. | Ш_пт – ш_птаць. |
| Зв_н – зв_ны. | Ш_лест – ш_лясцець. |

**Заданне №3:** падабраць аднакаранёвыя словы, каб *о, э* перайшло ў *а*. Узор: дрома – дрымота. Запісаць у сшытак. (Для ўсіх.)
1.Кроў - _________.
2.Дровы – _______.
3.Брод – _________.
4.Глотка – _______.
5.Крошка – _______.
**Заданне №4.** Прыём «Карэктар».Выправіце памылкі і запішыце словы.
Хрэстаматыя, крашыць , драўляны, інжэнер ,кандытар, цана, глатаць , трыа, трэвожны, сальфеджыа, яблык, фламастэр.
**Заданне №5.** Паставіць націск у кожным слове. Уставіць прапушчаныя літары.

| | |
|---|---|
| Кл _пат – кл _паціцца. | Пр_ста – спр_сціць. |
| Ц_лы – ац_лелы. | Спр_чка – спр_чацца. |
| Прыч_п – ч_пляць. | Прац_джаны – прац_дзіць. |
| Р_зум – р_зумовы. | Ц_гла – ц_гляны. |
| Ж_мчуг – ж_мчужына. | К_лер – к_ляровы. |

**Заданне 6.** Вусны пераклад.
Жёлтый, река, чемодан, широкий, жёлудь, корень,чёрствый, серый, жевать, чебурек, передать, шерсть.

**Заданне №1**
🌍 1-я група выпіша словы, у якіх пішуцца о, э, а ў спрадвечна беларускіх
словах;
🌍 2-я група выпіша словы са спалучэннямі -ро-, -ло;
🌍 3-я група выпіша словы, у якіх ненацiскныя спалучэнні -эль,
-эр- у запазычаных словах перадаюцца як –ар, -аль;
🌍 4-я група выпіша словы, у якіх захоўваюцца спалучэнні -эр-,-эль;
**Словы.** Шніцаль, сон, грэйдар, сэрца, камп'ютар, галасы, майстар, Одэр, карані, Юпітэр, Ландэр, колас, гром, глотка, блохі, дровы,
**Заданне №2:** уставіць прапушчаныя літары, растлумачыць правапіс арфаграм. (Два вучні пішуць на дошцы, а астатнія – у сшытках.)

| 1 група | 2 група |
|---|---|
| Г_лас – г_ласы. | Р_кі – р_ка. |
| З_лата – з_латы. | Стр_хі – стр_ха. |
| Р_сы – р_са. | Тр_сці – тр_суць. |
| Г_рад – г_рады. | Др_ва – др_ўляны. |
| М_ст – м_сты. | Ш_пт – ш_птаць. |
| Зв_н – зв_ны. | Ш_лест – ш_лясцець. |

**Заданне №3:** падабраць аднакаранёвыя словы, каб *о, э* перайшло ў *а*. Узор: дрома – дрымота. Запісаць у сшытак. (Для ўсіх.)
1.Кроў - _________.
2.Дровы – _______.
3.Брод – _________.
4.Глотка – _______.
5.Крошка – _______.
**Заданне №4.** Прыём «Карэктар».Выправіце памылкі і запішыце словы.
Хрэстаматыя, крашыць , драўляны, інжэнер ,кандытар, цана, глатаць , трыа, трэвожны, сальфеджыа, яблык, фламастэр.
**Заданне №5.** Паставіць націск у кожным слове. Уставіць прапушчаныя літары.

| | |
|---|---|
| Кл _пат – кл _паціцца. | Пр_ста – спр_сціць. |
| Ц_лы – ац_лелы. | Спр_чка – спр_чацца. |
| Прыч_п – ч_пляць. | Прац_джаны – прац_дзіць. |
| Р_зум – р_зумовы. | Ц_гла – ц_гляны. |
| Ж_мчуг – ж_мчужына. | К_лер – к_ляровы. |

**Заданне 6.** Вусны пераклад.
Жёлтый, река, чемодан, широкий, жёлудь, корень,чёрствый, серый, жевать, чебурек, передать, шерсть.

# Угадай літару

1 варыянт

А. Вызначце правільныя пары слоў:

1) кроў- крывавы;

2) крошка – крашыць;

3) бровы – браво.

Б. Вызначце словы, якія няправільна запісаныя:

1) шніцаль; 3) світэр;

2) камп’ютэр; 4) Юпітэр.

2 варыянт

А. Вызначце правільныя пары слоў:

1) дрома – драмота;

2) брод – брысці;

3) дровы – дравотня.

Б. Вызначце словы, якія няправільна запісаныя:

1) кандытар; 3) фламастэр;

2) майстэр; 4) Одэр.

1 варыянт

А. Вызначце правільныя пары слоў:

1) кроў- крывавы;

2) крошка – крашыць;

3) бровы – браво.

Б. Вызначце словы, якія няправільна запісаныя:

1) шніцаль; 3) світэр;

2) камп’ютэр; 4) Юпітэр.

2 варыянт

А. Вызначце правільныя пары слоў:

1) дрома – драмота;

2) брод – брысці;

3) дровы – дравотня.

Б. Вызначце словы, якія няправільна запісаныя:

1) кандытар; 3) фламастэр;

2) майстэр; 4) Одэр.

1 варыянт

А. Вызначце правільныя пары слоў:

1) кроў- крывавы;

2) крошка – крашыць;

3) бровы – браво.

Б. Вызначце словы, якія няправільна запісаныя:

1) шніцаль; 3) світэр;

2) камп’ютэр; 4) Юпітэр.

2 варыянт

А. Вызначце правільныя пары слоў:

1) дрома – драмота;

2) брод – брысці;

3) дровы – дравотня.

Б. Вызначце словы, якія няправільна запісаныя:

1) кандытар; 3) фламастэр;

2) майстэр; 4) Одэр.